*А.В. БУРАЧОНАК*

# ПРАМЫСЛОВЫЯ ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ Ў САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫМ ЖЫЦЦІ БЕЛАРУСІ КАНЦА XIX – ПАЧАТКУ XX ст. (на прыкладзе Фабрыкі па вытворчасці шпалераў К.М. Кантаровіча)

На примере купеческой обойной фабрики рассматривается деятельность промышленных предпринимателей в фабрично-заводской сфере производства. Выявляются основные механизмы в социальной сфере, направленные на обеспечение стабильности на предприятии, анализируются пути повышения прибыльности и достижения лидирующих позиций на рынке.

In this article the activities of industrial entrepreneurs in the factory sphere of industry, through the example of a merchant`s wallpaper factory, are covered. Basic mechanisms in social sphere aimed to ensure stability in the company are revealed, ways to improve profitability and achieve leading position in the market are examined.

З развіццём капіталістычных адносін у грамадстве звычайна звязваюць мэтанакіраваную і актыўную прадпрымальніцкую дзейнасць, хоць асобныя яе элементы назіраюцца яшчэ ў феадальным грамадстве. Буржуазныя рэформы стваралі ўмовы для больш хуткага развіцця фабрычна-заводскай сферы вытворчасці, заснаванай на прымяненні машын і паравых рухавікоў. Асаблівы этап развіцця прамысловага прадпрымальніцтва на тэрыторыі Беларусі прыпадае на канец XIX – пачатак XX ст. У гэты перыяд сярод прамысловай эліты актывізуецца імкненне да арганізацыйнага адзінства, адбываецца пошук шляхоў абароны сваіх інтарэсаў. У беларускіх губернях дадзены працэс меў свае асаблівасці, якія тычыліся, перш за ўсё, фарміравання слоя мясцовай прамысловай буржуазіі і далейшага станаўлення прамысловага прадпрымальніцтва. Дадзеныя асаблівасці былі абумоўлены мясцовымі эканамічнымі ўмовамі, а таксама ўнутранай і знешняй палітыкай Расійскай імперыі. Пачынаючы з сярэдзіны 1890-х гг., эканамічная кан’юнктура стала складвацца больш спрыяльна: назіраўся рост коштаў на прамысловыя і сельскагаспадарчыя тавары, павялічваўся намінальны і рэальны заробак, інвестыцыі, якія былі ўкладзены ў сучасныя галіны прамысловасці, прыносілі ўзрастаючы прыбытак. Лідарства ў дзелавым свеце пачынае паступова пераходзіць ад фабрыкантаў традыцыйных галін вытворчасці да фабрыкантаў перадавых тэхналогій.

Перыяды, звязаныя з ажыццяўленнем карэнных змен у грамадстве, заўсёды выклікаюць асаблівую цікавасць. Да такіх перыядаў у айчыннай гісторыі адносіцца, безумоўна, канец XIX – пачатак XX ст., час буржуазных рэформаў, паска-

рэння развіцця капіталістычных адносін, распаўсюджвання фабрычна-заводскай прамысловасці як на тэрыторыі беларускіх губерняў, так і Расійскай імперыі ў цэлым. Даследаванне прадпрымальніцкай актыўнасці ў фабрычна-заводскай сферы вытворчасці Беларусі мае вялікае значэнне для вывучэння пытання фарміравання прамысловай эліты краіны ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Нягледзячы на гэта, у айчыннай гістарыяграфіі комплекснага даследавання, прысвечанага дадзенай праблеме, не існуе. Пэўныя аспекты адзначанага пытання знайшлі адлюстраванне ў працах М.Ф. Болбаса, А.П. Жытко, А.Л. Кіштымава, Н.І. Палятаевай, З.В. Шыбекі[1] і інш.

Пачынаючы з савецкіх часоў, сацыяльна-эканамічныя працэсы разглядаюцца, як правіла, айчыннымі даследчыкамі на макраўзроўні, а вывучэнне гісторыі канкрэтных прадпрыемстваў рэдка станавілася прадметам самастойнага даследавання. Разгляд жа працэсаў на мікраўзроўні дазваляе дэталёва вывучыць функцыянаванне пэўнага механізму кіравання, выявіць, як агульна-дзяржаўныя рашэнні прымяняліся лакальна, і, увогуле, прасачыць, як асобны прадпрымальнік паводзіў сябе ў вызначаных гістарычных умовах.

Артыкул падрыхтаваны на аснове матэрыялаў фондаў 299 (Мінскае губернскае праўленне), 311 (Старэйшы Фабрычны інспектар Мінскай губерні) і 455 (Фабрыка па вытворчасці шпалераў К.М. Кантаровіча) Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ) у Мінску з прыцягненнем статыстычных звестак са зборнікаў «Список фабрик и заводов Европейской России» за 1903, 1910 і 1912 гг. Адзначаныя фонды змяшчаюць шэраг каштоўных крыніц па сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі. Аналіз дадзеных дазваляе прасачыць, з дапамогай якіх крокаў у сацыяльным і эканамічным кірунку К.М. Кантаровіч за кароткі час здолеў пераўтварыць маленькую фабрыку ў шматпрофільнае магутнае прамысловае прадпрыемства.

У выніку паступовай лібералізацыі заканадаўства Расійскай імперыі, у першую чаргу падатковага, у канцы XIX – пачатку XX ст. усе катэгорыі насельніцтва атрымалі права займацца гандлёва-прамысловай дзейнасцю. Гэта нанесла канчатковы ўдар па саслоўных прынцыпах арганізацыі прадпрымальніцтва, якія былі замацаваны рэформамі Кацярыны II. Прадпрымальніцтвам у заходніх губернях Расійскай імперыі займаліся прадстаўнікі дваранскага, купецкага, мяшчанскага і іншых саслоўяў. Найбольш яскравай асаблівасцю, што адрознівала купецтва ад іншых сацыяльных груп, з якіх складалася расійская буржуазія, стала раўнамернасць прадстаўніцтва ва ўсіх сферах вытворчасці, за выключэннем вінакурэння – традыцыйнай сферы дзейнасці дваранства.

Нягледзячы на крызіс канца 1880-х – пачатку 1890-х гг., купецкае саслоўе пачало засвойваць новыя галіны вытворчасці. Вынікам гэтага працэсу стала паскарэнне назапашвання капіталу і пералівання яго ў сферу прамысловасці. Да пачатку XX ст. сфарміраваліся асноўныя рысы расійскага капіталізму. Ужо адбіваліся вынікі тэхнічнага перавароту, пачаўшайся індустрыялізацыі і эканамічнай палітыкі, арыентаванай з 1860-х гг. на заахвочванне рынкавай гаспадаркі. У пачатку XX ст. колькасць прамысловых прадпрыемстваў, якімі валодала купецкае саслоўе, узрасла нязначна. Вызначылася галіновае дамінаванне купецкіх прамысловых прадпрыемстваў у асобных галінах харчасмакавай і хімічнай прамысловасці, металаапрацоўцы і апрацоўцы мінеральных рэчываў. Значны рост колькасці фабрык і заводаў купецкага саслоўя назіраўся ў дрэваапрацоўцы, асабліва ў лесапільнай і папярова-паліграфічнай галінах дадзенай вытворчасці. Менавіта апошняя галіна, а дакладней адна з яе падгалін – вытворчасць шпалераў, знаходзілася ў ліку самых перадавых і канкурэнтаздольных кірункаў беларускай эканомікі таго часу. Самымі вядомымі і буйнымі прадпрыемствамі па вытворчасці шпалераў на тэрыторыі Беларусі ды і ва ўсёй Расійскай імперыі былі фабрыка братоў Мееровічаў у Віцебску, а таксама 2 мінскія купецкія фабрыкі – Абрама Эпштэйна іКівы Меера Кантаровіча. На апошняй спынімся падрабязней.

Мінская фабрыка па вытворчасці шпалераў была заснавана ў 1891 г. Е.В. Хаюціным[2]. Яна з'яўлялася невялікім прадпрыемствам з нязначнай колькасцю працоўных, якую абмінуў працэс мадэрнізацыі па прычыне адсутнасці ў яе ўладара сродкаў фінансавання, прафесійных ведаў і, урэшце, зацікаўленасці ва ўдасканальванні. Патрэбна адзначыць, што ні ў адной статыстычнай справаздачы таго часу дадзенае прамысловае прадпрыемства не ўзгадваецца. Вядома толькі, што 25 ліпеня 1900 г. адбылася перадача мінскай фабрыкі па вытворчасці шпалераў Е.В. Хаюціна купцу 1-й гільдыі К.М. Кантаровічу[3]. Пасля пераходу ва ўласнасць прадпрыемства новым гаспадаром былі зроблены захады па ўдасканальванні фабрыкі. Амаль праз паўгода, 26 лютага 1901 г., Мінская Гарадская ўправа дала згоду на арганізацыю фабрыкі ў новым будынку на вуліцы Нямігскай[4], які 14 сакавіка 1901 г. быў адобраны ўсімі інстанцыямі[5]. 20 чэрвеня 1901 г. прадпрыемства пачало працу на новым месцы. У 1903 г. быў зацверджаны праект пабудовы каменнага флігеля і памяшкання для паравога катла[6], які быў усталяваны 7 ліпеня 1904 г.[7] Менавіта з гэтага часу пачынаецца жыццё новай фабрыкі па вытворчасці шпалераў.

Але праведзеныя навоўвядзенні тычыліся не толькі знешняга ўладкавання прамысловага прадпрыемства, але і ўнутранага. 22 жніўня 1900 г. былі ўведзены правілы ўнутранага распарадку на фабрыцы. Шматлікія пункты гэтага дакумента, якія за час існавання прадпрыемства

удакладняўся 2 разы, вызначалі правілы паводзін працоўных, а таксама рэгулявалі іх сацыяльныя правы. Патрэбна падрабязна спыніцца на некаторых момантах дадзенага лакальнага прававога акта. Чалавек, які ўладкоўваўся на працу, павінен быў прадставіць загадчыку фабрыкі дакумент, што пацвярджаў асобу, з указаннем месца жыхарства (пры яго змене – тэрмінова паведамляць аб гэтым кіраўніцтву). На працягу тыдня пасля ўладкавання працоўны атрымліваў разліковую кніжку, у якой пазначаліся прозвішча, імя, імя па бацьку, пасада, тэрмін і ўмовы найму працоўнага; у дадзеную кніжку рабіўся запіс аб заробку, які выплачваўся працоўным 2 разы – у 1-ы і 15-ы дзень кожнага месяца. Заробак налічаўся згодна з умовамі дагавору найму: памесячна, падзённа або ў залежнасці ад колькасці выробленага тавару. Калі працоўны звальняўся або яго звальнялі, павінна было паступіць папярэджанне аб звальненні за 2 тыдні[8]. У гісторыі фабрыкі былі цікавыя выпадкі, калі супрацоўнікаў звальнялі за лаянку з загадчыкам, знаходжанне на тэрыторыі ў нецвярозым стане, доўгатэрміновую адсутнасць на працоўным месцы, што было забаронена правіламі. Але звальняліся гэтыя працоўныя без двухтыднёвага папярэджання, таму вярталіся мясцовымі ўладамі на свае месцы працы[9].

Праца на фабрыцы ажыццяўлялася з 6 гадзін раніцы да 7 гадзін вечара (на 1 гадзіну менш, чым пры былым уладары фабрыкі Е.В. Хаюціне), з двума перапынкамі на сняданак і абед. Падчас гэтых перапынкаў працоўныя маглі сыходзіць з фабрыкі без дазволу (у астатні час гэта забаранялася) або ісці ў спецыяльна абсталяваныя месцы для прыёму ежы. Па суботах і напярэдадні святочных дзён праца заканчвалася ў палове шостай гадзіны вечара. Таксама працоўныя мелі права на бясплатнае медыцынскае абслугоўванне, прычым лекар дапамагаў людзям як на фабрыцы, так і наведваў хворых супрацоўнікаў па месцы жыхарства. Апошнім аплачваўся бальнічны ліст, які складаў палову заробку. Працоўныя, якія жылі ў нястачы, маглі атрымаць заводскую кватэру. Правілы пражывання ў ёй былі вельмі простымі – захоўваць чысціню і парадак, забаранялася прыходзіць у нецвярозым стане і прыносіць гарэлку, з'яўляцца пазней усталяванага адміністрацыяй часу. Існаваў на фабрыцы і табель штрафаў. Самае вялізнае грашовае пакаранне было за неасцярожнае абыходжанне з агнём і за паленне на тэрыторыі фабрыкі (1 рубель); за з'яўленне на фабрыцы ў нецвярозым выглядзе, за непаслухмянасць пры законных патрабаваннях, за незахаванне чысціні на працоўным месцы і ў прыбіральні, за псаванне тавару – 50 капеек; за спазненне і самавольную адлучку з працы больш як на 10 хвілін і за азартныя гульні – 30 капеек[10]. Гэтыя штрафы ішлі не на асабістыя патрэбы ўладальніка або загадчыка фабрыкі, а збіраліся ў спецыяльную «касу штрафных грошаў». Менавіта з гэтай касы ішлі сродкі на матэрыяльную дапамогу працоўным, якія адчувалі вострую неабходнасць (смерць родных, цяжкае захворванне і інш.)[11]. Але ўсе гэтыя захады да змякчэння ўмоў працы не змаглі захаваць фабрыку ад першай расійскай рэвалюцыі.

Расстрэл дэманстрантаў каля Зімняга палаца ў студзені 1905 г. ускалыхнуў усю краіну. Паўсюдна пачаліся забастоўкі салідарнасці, стачкі, вулічныя дэманстрацыі. Паступова на змену палітычным выступленням прыйшлі забастоўкі эканамічнага характару. Рабочыя фабрыкі па вытворчасці шпалераў К.М. Кантаровіча таксама былі ўцягнуты ў гэтыя працэсы. Аднак цалкам праца прадпрыемства не была спынена. Яшчэ ў самым пачатку рэвалюцыйнага руху былі зроблены захады па змякчэнні ўмоў працы. Першым крокам стала скарачэнне працоўнага дня на 1 гадзіну пры захаванні адпачынкаў на сняданак і абед[12]. І ўжо 12 снежня 1905 г. К.М. Кантаровіч паведамляў Старэйшаму Фабрычнаму інспектару, што «палітычная забастоўка скончана, і ўсе працоўныя вярнуліся на працоўныя месцы»[13]. Другім крокам стаў пераход фабрыкі 2 лістапада 1906 г. да працы ў 2 змены. Першая змена працавала з 7.30 да 18.00, другая – з 18.00 да 4.30 (з перапынкам на абед у адну гадзіну на кожнай змене)[14]. Пры існуючых умовах працы колькасць працоўных на фабрыцы з году ў год няўхільна павялічвалася. Па існуючых звестках у 1900 г. там працавалі 24 чал., к пачатку 1903 г. – 25 чал., 1910 г. – 65 чал., а ў канцы 1913 г. агульная колькасць працоўных складала 325 чал.[15] Такое рэзкае павелічэнне колькасці працоўных было абумоўлена ўвядзеннем у эксплуатацыю трэцяга паверха фабрыкі ў 1910 г. і пачаткам вырабу ў 1911 г. рознакаляровай паперы. У 1914 г. адбываецца падзел усіх працоўных фабрыкі (акрамя майстроў) на наступныя катэгорыі: простыя працоўныя, качагары, машыністы, вартаўнікі. Працоўны графік вызначаўся асобна для кожнай з катэгорый[16].

На фабрыцы вырабляліся шпалеры, розныя віды паперы (альбомная, папяросная, абгортачная, афішная і інш.) і, як адзначалася, з 1911 г. рознакаляровая папера. Тое, што прадукцыя была вельмі высокай якасці, пацверджана шматлікімі станоўчымі водгукамі заказчыкаў. Неаднаразова сустракаюцца пісьмы, што ўтрымліваюць у сабе інфармацыю аб атрыманні паперы, пацвярджэнні плацяжоў і просьбы аб пастаўцы новай партыі[17]. Прадукцыя мінскай фабрыкі К.М. Кантаровіча пастаўлялася як у гарады беларускіх губерняў (Вільня, Гродна, Магілёў, Віцебск, Дзвінск, Полацк, Брэст, Пінск), так і па ўсёй астатняй тэрыторыі Расійскай імперыі (Баку, Рыга, Варшава, Кіеў, Адэса, Коўна, Чарнігаў, Батумі, Грозны, Лібава, Армавір, Стаўрапаль, Растоў-на-Доне, Бендэры, Бярдзічаў)[18]. Пры буйных заказах існавала сістэма зніжак. Памеры іх былі ад 5 да 20 % і

залежалі ад велічыні паставак[19]. Самыя вялікія зніжкі (20 %) мелі два пакупнікі – Мустафа Малікаў з Баку і С. Равіцкі з Варшавы за неаднаразовую пастаўку прадукцыі ў памеры звыш 270 лістоў[20]. Фабрыка па вытворчасці шпалераў К.М. Кантаровіча супрацоўнічала не толькі з прыватнымі асобамі, але і са шматлікімі прадпрыемствамі Расійскай імперыі. Сярод іх: Папяровая фабрыка ў горадзе Кноппа, Паравыя Турэцка-Тытунёвая і Махорачная фабрыкі ў Чаркасах, Паравая Тыпа-Літаграфія і фабрыка талонных і чэкавых кніжак і папяровых вырабаў для аптэк у Барысаве, Фабрычнае дэпо разнастайных папяросных, рознакаляровых і іншых папер Л.І. Маргуліс, Электралітаграфія Зенефельдэр у Мінскай губерні і інш[21]. Частка паперы, якая пастаўлялася ў іншыя губерні, збывалася па сродках менавіта гэтых фабрык. Асабліва цеснае супрацоўніцтва было з папяровай фабрыкай «Скіна», якое бярэ свой пачатак з 1904 г. Яна была адным з буйнейшых прадпрыемстваў у гэтай галіне. Менавіта праз гэтае прадпрыемства збывалася вялікая колькасць прадукцыі, што, урэшце рэшт, прывяло да ўключэння 27 верасня 1912 г. мінскай фабрыкі ў спіс прадстаўнікоў папяровай фабрыкі «Скіна»[22]. Наладжаныя гандлёвыя сувязі апошняй давалі К.М. Кантаровічу яшчэ больш шырокія магчымасці для збыту прадукцыі.

У пачатку 1914 г. К.М. Кантаровіч разнастаіў профіль свайго прадпрыемства, калі на ім былі дадаткова адчынены пякарны і сухарасушыльны заводы. Напэўна, дадзеную падзею можна лічыць кульмінацыйнай кропкай у гісторыі мінскай фабрыкі па вытворчасці шпалераў, бо далей пачынаецца яе паступовы заняпад. У першую чаргу ён быў звязаны з пачаткам Першай сусветнай вайны, у першыя месяцы якой шматлікія галіны прамысловасці, што непасрэдна не былі звязаны з ваеннымі патрэбамі, апынуліся ў заняпадзе. У іх ліку былі цагляна-кафельная, шкларобчая, вінакурная і дрэваапрацоўчая. 17 жніўня 1914 г. К.М. Кантаровіч паведамляў Старэйшаму Фабрычнаму інспектару, што па прычыне недахопу паліва, непрыняцця грузаў па чыгунцы і дрэннага фінансавага становішча на фабрыцы часова прыпынена праца. 19 лістапада 1914 г. прадпрыемства зноў запрацавала, але не на ўсю моц. Праца ўзнавілася на пякарным і сухарасушыльным заводах, часткова працаваў аддзел, дзе выраблялася папера. Але ўжо 21 красавіка 1915 г. скарацілі частку працоўных на пякарным заводзе, 29 мая была адменена начная змена на фабрыцы, а з 7 верасня была канчаткова спынена вытворчасць паперы. На гэтым перастае існаваць мінская фабрыка па вытворчасці шпалераў і рознакаляровай паперы. Да 1916 г. працавалі пякарны і сухарасушыльны заводы, але пасля пажару 27 студзеня праца была спынена і там[23]. Пасля ўстанаўлення савецкай улады ў краіне будынак з абсталяваннем, якое там захавалася, быў нацыяналізаваны.

Такім чынам, пэўная прававая падтрымка прадпрымальнікаў з боку дзяржавы і амаль поўнае неўмяшальніцтва ў іх справы стварылі ў канцы XIX – пачатку XX ст. спрыяльныя ўмовы для выяўлення і развіцця прадпрымальніцкай ініцыятывы. За няпоўныя 16 гадоў свайго кіравання фабрыкай К.М. Кантаровіч здолеў пераўтварыць яе ў магутнае, шматпрофільнае прадпрыемства. Кантаровіч здолеў ажыццявіць дадзеныя змены з дапамогай прадуманай палітыкі ў сацыяльным (скарачэнне і ўвядзенне двухзменнага працоўнага дня, забеспячэнне сацыяльнымі гарантыямі працоўных) і эканамічным (наладжванне міжнародных сувязей, сістэма зніжак) кірунках. Не ў апошнюю чаргу поспех у справах спадарожнічаў прамысловым прадпрымальнікам не з-за няструмнай эксплуатацыі, але дзякуючы сацыяльна адказным паводзінам, часам сапраўды чалавечнаму стаўленню да сваіх працаўнікоў.

[1] Гл.: Болбас М.Ф. Промышленность Белоруссии 1860–1900. Мн., 1978; Жытко А.П. Дваранства Беларусі перыяду капіталізма. 1861–1914 гг. Мн., 2003; Киштымов А.Л. Экономика Белоруссии XIX – начала XX в.: государственная политика и частная инициатива // Экономическая история России XIX–XX вв.: современный взгляд. М., 2000. С. 132–145; Полетаева Н.И. Купечество Беларуси: 60-е гг. XIX – начало XX в. Мн., 2004; Шыбека З.В. Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX ст.). Мн., 1997.
[2] Гл.: Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 311. Воп. 1. Спр. 119. Л. 2.
[3] Там жа. Л. 8.
[4] Там жа. Ф. 299. Воп. 5. Спр. 1515. Л. 8.
[5] Там жа. Ф. 299. Воп. 1. Спр. 745. Л. 42–43.
[6] Там жа. Ф. 299. Воп. 5. Спр. 1515. Л. 22.
[7] Там жа. Ф. 311. Воп. 1. Спр. 280. Л. 5.
[8] Там жа. Ф. 311. Воп. 1. Спр. 119. Л. 20.
[9] Там жа. Л. 48–49.
[10] Там жа. Л. 20–21.
[11] Там жа. Л. 164.
[12] Там жа. Л. 76.
[13] Там жа. Л. 87.
[14] Там жа. Л. 98–99.
[15] Гл.: НГАБ. Ф. 311. Воп. 1. Спр. 119. Л. 20; Список фабрик и заводов Российской империи / Под ред. В.Е. Варзара. СПб., 1903. С. 149; Список фабрик и заводов Российской империи / Под ред. В.Е. Варзара. СПб., 1910. С. 150; НГАБ. Ф. 311. Воп. 1. Спр. 119. Л. 184.
[16] Гл.: НГАБ. Ф. 311. Воп. 1. Спр. 119. Л. 138, 162, 189.
[17] Там жа. Ф. 455. Воп. 1. Спр. 50.
[18] Там жа. Ф. 455. Воп. 1. Спр. 8.
[19] Там жа. Л. 257–280.
[20] Там жа. Л. 266, 270.
[21] Там жа. Ф. 455. Воп. 1. Спр. 50.
[22] Там жа. Ф. 455. Воп. 1. Спр. 27. Л. 18.
[23] Там жа. Ф. 311. Воп. 1. Спр. 119. Л.205–211, 221–222.

Паступіў у рэдакцыю 18.06.10.

***Аляксандр Вячаслававіч Бурачонак*** – аспірант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу А.Г. Каханоўскі.